Н.М. ЗДАСЮК

# ІНФАРМАЦЫЙНА-ЗАХАВАЛЬНІЦКІЯ РЭСУРСЫ МУЗЕЯЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У 90-я гг. XX ст.

На основе исследования первоисточников и анализа научной литературы делается вывод: в 90-е гг. XX в. учетно-хранительская деятельность в музеях Беларуси поднялась на новый уровень в связи с использованием возможностей информационных технологий; отмечается, что компьютеризация фондовой работы вызвала необходимость разработки стандартов научного описания музейных предметов.

Based on the investigation of the original material and the analysis of scientific literature on the subject the author comes to the following conclusion: the activities on registration and storage in the museums of Belarus in the 90's of the XX century were largely initiated owing to the use of informational technologies. It is pointed out that the computerization of archive work brought about the need for the development of standards of scientific description of museum objects.

Адной з асноўных тэндэнцый развіцця музейнай справы ў Рэспубліцы Беларусь у 90-я гг. XX ст. з'яўляецца імкненне да вяртання музею яго спрадвечнай місіі - захавальніка сацыяльнай памяці. Дыскусіі па гэтай праблеме разгарнуліся з канца 1980-х гг. Адной з галоўных умоў надання большай увагі захавальніцкай дзейнасці называлася павышэнне адказнасці музеяў за ўласныя фондавыя калекцыі. Недастатковая ўвага да навуковай інвентарызацыі ў папярэдні перыяд прывяла да складання такой сітуацыі, што часам супрацоўнікі музеяў не ведалі свае фонды. Музейныя прадметы ў большасці выпадкаў не былі апрацаваны на належным узроўні. Галоўнае ж палажэнне фондавай работы музеяў сцвярджае, што няўлічаныя або няправільна ўлічаныя, навукова неапрацаваныя фонды непрыдатны да выкарыстання. Практычна такое становішча ў беларускіх музеях пачало змяняцца ў 1990-х гг., калі асноўная ўвага стала надавацца даследаванню музейнага прадмета, яго ролі і месца ў гісторыі і культуры.

Для павышэння тэмпаў і ўзроўню апрацоўкі фондавых калекцый пачалася камп'ютэрызацыя музейнай справы рэспублікі. Згодна з прынятай на Беларусі праграмай інфарматызацыі на 1991-1995 гг. прадугледжвалася стварэнне тыпавой аўтаматызаванай музейнай сістэмы. У 1992 г. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Вучоны савет Беларускага інстытута праблем культуры зацвердзілі «Канцэпцыю стварэння інфармацыйных баз дадзеных па культуры», у якой былі выкладзены асноўныя прынцыпы такой сістэмы. Аўтаматызацыі падлягалі наступныя віды музейнай дзейнасці: улік і рэгістрацыя музейных прадметаў; сістэматызацыя і вядзенне навуковых апісанняў экспанатаў і калекцый; каталагізацыя апісанняў музейных прадметаў і вядзенне каталогаў і картатэк; планаванне і ўлік працы супрацоўнікаў, падраздзяленняў; музейная статыстыка; экспазіцыйна-выставач-

ная, лекцыйна-экскурсійная, рэдакцыйна-выдавецкая віды дзейнасці; інфармацыйна-даведачнае абслугоўванне; адміністрацыйна-гаспадарчая работа[1]. Такім чынам, згодна з гэтым пералікам камп'ютэрызацыі падлягае работа па апрацоўцы музейных фондаў, аб прыярытэце якой сведчыць і той факт, што ўкараненне падсістэмы «Фонды» планавалася правесці на першым этапе (1993-1994). Канчатковай мэтай камп'ютэрызацыі музейнай справы рэспублікі было стварэнне зводнага электроннага каталога з захоўваннем апісанняў усіх музейных прадметаў, што знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь. Планавалася стварыць міжмузейны інфармацыйны цэнтр, да якога падключыць усе музеі рэспублікі з далейшым выхадам у Інтэрнэт[2]. Спачатку ў інфармацыйную сістэму павінны былі ўвайсці музеі рэспубліканскага падпарадкавання, потым абласнога (1995-1996) і напрыканцы - раённыя (1996-1998).

Аднак адзначым, што з самага пачатку інфармацыйныя сістэмы ў музеях рэспублікі ўкараняліся не так, як планавала Міністэрства культуры. Першымі прыступілі да камп'ютэрызацыі фондавай работы супрацоўнікі Дзяржаўнага гісторыка-культурнага запаведніка «Заслаўе». У 1991 г. яны сумесна з супрацоўнікамі Вылічальнага цэнтра Мінскага радыётэхнічнага інстытута пачалі распрацоўку праграмы аўтаматызацыі фондаў, у аснову якой быў пакладзены вопыт па камп'ютэрызацыі фондавай работы Траццякоўскай галерэі і Цэнтральнага музея Рэвалюцыі СССР. Распрацаваная праграма «АРМ захавальніка фондаў» накіравана на аўтаматызацыю першаснага ўліку і навуковага апісання музейных прадметаў. Яна ж дазваляе атрымліваць даведкі і статыстычныя матэрыялы, весці падрыхтоўку калекцыйных каталогаў і каталогаў выстаў, ажыццяўляць друк музейнай дакументацыі.

Увод дадзеных у базу першаснага ўліку і навуковай апрацоўкі супрацоўнікамі аддзела фондаў запаведніка «Заслаўе» пачаўся з 1992 г. У наступным годзе на аснове «АРМ захавальніка фондаў» былі распрацаваны адпаведныя праграмы для Мінскага абласнога музея і Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка з улікам асаблівасцей іх калекцый. Праца па запаўненню баз дадзеных першаснага ўліку ў названых музеях пачалася ў тым жа 1993 г.[3]

Большая частка музеяў выкарыстоўвала ў фондавай рабоце праграму, створаную ў 1993-1994 гг. па дамове з Міністэрствам культуры навукова-вытворчай фірмай ІНЕАК, у якой быў улічаны вопыт Дзяржаўнага рускага музея, Дзяржаўнага Эрмітажа і сістэмы ўліку музейных прадметаў Траццякоўскай галерэі. З гэтага часу пачаўся ўвод інфармацыі ў базы дадзеных у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дзяржаўным аб'яднанні літаратурных музеяў, Дзяржаўным літаратурным музеі Я. Купалы, Дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту[4]. У наступныя гады да аўтаматызацыі фондавай працы далучаліся іншыя музеі сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Аднак недасканаласць дадзенай сістэмы была відавочна ўжо на першай стадыі працы. У 1997 г. на аснове абагульнення вопыту працы аўтаматызаванай музейнай сістэмы і новай інструкцыі Міністэрства культуры па рабоце з фондамі з улікам апошніх дасягненняў камп'ютэрных тэхналогій была распрацавана новая версія праграмы.

Такім чынам, з самага пачатку камп'ютэрызацыі фондавай работы ў музеях рэспублікі назіраецца супярэчнасць. Праграма інфарматызацыі, накіраваная ў выніку на стварэнне зводнага электроннага каталога Музейнага фонда Беларусі, пачала рэалізоўвацца ў дзвюх розных сістэмах.

Асноўнай перашкодай пры рабоце над аўтаматызаванымі сістэмамі ў музеях стаў недахоп фінансавых сродкаў на набыццё абсталявання. Так, нават у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры ў 1995 г. было толькі шэсць камп'ютэраў, з іх неабходнымі тэхнічнымі характарыстыкамі валодалі

чатыры машыны. Між тым для паўнацэннага функцыянавання толькі першай чаргі аўтаматызаванай сістэмы гэтаму музею неабходна не менш 25 персанальных камп'ютэраў. З-за скасавання фінансавання ў 1994 г. былі спынены работы, пачатыя па стварэнню міжмузейнага інфармацыйнага цэнтра на базе Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Нацыянальнага музея гісторыі і культуры. Менавіта адсутнасцю сродкаў на набыццё тэхнікі і праграм тлумачацца ў першую чаргу вельмі марудныя тэмпы камп'ютэрызацыі музеяў Беларусі. Амаль за дзесяць год з пачатку ўкаранення інфармацыйных тэхналогій у музеях камп'ютэрныя праграмы пачалі выкарыстоўваць толькі 12% музеяў краіны[5]. Аднак нізкія тэмпы камп'ютэрызацыі музейнай справы нельга тлумачыць толькі матэрыяльнымі цяжкасцямі. Вялікай перашкодай на гэтым шляху з'яўляецца інертнасць і кансерватызм саміх музейных супрацоўнікаў, а таксама кіраўнікоў гэтых устаноў. Практыка паказала, што там, дзе было разумение важнасці гэтага працэсу з боку кіраўніцтва, справа рухалася даволі хутка. Напрыклад, у Мінскай вобласці ўсе дзяржаўныя музеі былі за кошт абласнога бюджэту забяспечаны не толькі камп'ютэрнай тэхнікай, але і пакетам адпаведных праграм па ўліку і навуковай інвентарызацыі фондаў. У выніку музеі Мінскай вобласці ў 2000 г. прадэманстравалі самы высокі паказчык апрацоўкі музейных фондаў[6].

Выкананне такой маштабнай задачы, як стварэнне зводнага электроннага каталога музейных каштоўнасцей краіны, акрамя тэхнічнага і праграмнага забеспячэння, патрабавала метадычнай і нарматыўнай дакументацыі, у першую чаргу ў галіне навуковага апісання музейных прадметаў, музейнай тэрміналогіі і класіфікацыі. Укараненне камп'ютэрных тэхналогій, пачатае ў 1990-х гг. у беларускіх музеях, вялося спантанна, без папярэдняй канцэптуальнай падрыхтоўкі. У тыя часы музейшчыкі найперш думалі аб аблягчэнні працы па ўліку і апісанню музейных прадметаў. Аднак з цягам часу ўзніклі пытанні аб музейных стандартах, тэрміналогіі, уніфікаваных схемах апісання музейных прадметаў. Прынятая ў 1997 г. інструкцыя «Аб парадку камплектавання, уліку, навуковай апрацоўкі, захавання і выкарыстання музейных прадметаў» паклала пачатак дзейнасці ў гэтым накірунку. У яе ўключылі шэраг стандартных узораў музейна-фондавай дакументацыі, а таксама з'явіліся спробы тыпалагічнай характарыстыкі беларускіх музеяў. Аднак гэты дакумент быў разлічаны ў першую чаргу на ўстановы, у якіх яшчэ не выкарыстоўвалася камп'ю-тэрная тэхніка, і рэкамендацыі па запаўненню часткі элементаў навуковага апісання не адпавядалі такому прынцыпу фарміравання дадзеных з выкарыстоўваннем камп'ютэрнай апрацоўкі, як структураванне інфармацыі. З другога боку, у шэрагу беларускіх музеяў ужо існуюць значныя напрацоўкі па тыпалагізацыі музейных калекцый, класіфікацыйных схемах, тэрміналогіі і інш. Гэты матэрыял, а таксама рэкамендацыі камітэта па музейнай дакументацыі Міжнароднага савета музеяў сталі асновай стварэння стандарту навуковага апісання прадметаў. На працягу 1999-2000 гг. вядучымі музейнымі супрацоўнікамі краіны быў распрацаваны стандарт навуковага апісання музейных прадметаў і класіфікацыйнай схемы музейных калекцый[7].

Пры ўкараненні аўтаматызаваных музейных сістэм, у першую чаргу для інфарматызацыі ўліку і навуковага апісання музейных прадметаў, ставілася мэта павысіць узровень гэтай дзейнасці, пазбавіўшы супрацоўнікаў ад неабходнасці шматразова дубліраваць інфармацыю ў розных кнігах, актах, картатэках. Аднак гэта мэта не была дасягнута. Да працы па вядзенню кніг паступленняў, інвентарных кніг дадалася і работа па ўводу прадметаў у камп'ютэр. Згодна з вышэйназванай інструкцыяй, ЭВМ не замяняюць улікова-захаваўчыя дакументы, якія маюць юрыдычную сілу (акты, інвен-

тарныя кнігі і кнігі спецыяльнага ўліку). Такім чынам, толькі частка руціннай працы па напісанню шматлікіх картатэк была заменена камп'ютэрнымі базамі дадзеных.

Пачаўшаяся камп'ютэрызацыя фондаў паказала, што немагчыма стварыць у кароткі тэрмін паўнацэнную аўтаматызаваную базу дадзеных аб музейным зборы. У буйных музеях рэспублікі, з якіх у 1990-х гг. пачалася камп'ютэрызацыя, стала ўводзіцца інфармацыя аб новых паступленнях. Звязана гэта з вялікай колькасцю прадметаў мінулых паступленняў, увесці звесткі аб якіх у кароткі тэрмін немагчыма. Так, маючы больш за 100 тыс. адзінак асноўнага фонду, Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (у якім працэс камп'ютэрызацыі фондаў пачаўся з 1994 г.) па стану на 2000 г. з дапамогай камп'ютэра можа апрацоўваць толькі пяць тысяч прадметаў паступленняў апошніх гадоў, астатняя ж інфармацыя па-ранейшаму захоўваецца на паперы[8].

Такім чынам, 1990-я гг. характарызуюцца актывізацыяй работы па інфармацыйна-захавальніцкай дзейнасці музеяў Беларусі, накіраванай на стварэнне зводнага электроннага каталога музейных каштоўнасцей. Для рэалізацыі гэтага праекта было шмат зроблена: распрацаваны стандарт навуковага апісання музейных прадметаў і уніфікаваных класіфікацыйных схем музейных калекцый, у 40 % музеяў рэспублікі ўсталявана камп'ютэрная сістэма «Фонды». Аднак у цэлым тэмпы камп'ютэрызацыі фондавай работы музеяў невысокія ў сувязі з недастатковым фінансаваннем дадзенай праграмы, а таксама з кансерватыўнасцю некаторых музейных супрацоўнікаў.

1 Гл.: Проект «Некоторые аспекты создания и внедрения автоматизированных музейных систем в Республике Беларусь» (1995) // Ведомственный архив Министерства культуры Республики Беларусь.

2 Гл.: Там жа.

3 Гл.: Рак А. Аўтаматызаваныя інфармацыйныя сістэмы ў музеях Беларусі // Музеі і культурная спадчына як частка глабальнай інфармацыйнай прасторы: Матэрыялы міжнар. канф. Полацк, 2002. С 66-68.

4 Гл.: Проект...

5 Гл.: Рак А. Указ. сач.

6 Гл.: Беларуская культура сёння: Гадавы агляд. Мн., 2002. С. 172-180.

7 Гл.: Плоткин А., Сташкевич А. О концепции создания сводного электронного каталога музейных предметов // Музеі і культурная спадчына... С. 103.

8 Гл.: Рак А. Указ. сач.

Паступіў у рэдакцыю 02.11.05.

***Наталля Міхайлаўна Здасюк*** - выкладчыца кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў.